**Уладзімір Карэлін, Мікалай Мельнікаў**

# Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 6)

Продовжено дослідження особливостей рідкісних сюжетів білоруської іконографії. Охарактеризовано сюжети смерті св. Йосифа, заручин Богородиці, св. Кирика та Юліта, св. Філіпа Нери та інші.

*Ключові слова:* ікона, сюжет, святі

У дадзеным паведамленні, як і ў папярэдніх [1, с. 335; 2, с. 486; 3, с. 152; 4, с. 95; 5, с. 109], разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных, рэдка сустракаемых на Беларусі абразоў, прыводзяцца іх тэхнічныя дадзеныя і падаюцца кароткія звесткі аб персанажах, згодна літаратурных крыніц [6–12]. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму календарах. Пераважная частка разглядаемага матэрыялу набыта падчас экспедыцыйных даследаванняў і ўпершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

**Смерць св. Іосіфа**. Святы Іосіф Абручнік (каля 90 да н. э., Віфлеем – 20 ліпеня 18, Назарэт), муж Марыі, маці Хрыста, і зямны апякун Ісуса, шануецца ў каталіцкай, праваслаўнай, усходняй праваслаўнай, англіканскай і лютэранскай цэрквах. Ён быў абвешчаны апекуном і абаронцам каталіцкай царквы Папам Піем IX у 1870 годзе, з'яўляецца заступнікам работнікаў, а таксама заступнікам некалькіх краін і рэгіёнаў. Згодна апакрыфічных звестак, Іосіф памёр ва ўзросце 111 гадоў, у прысутнасці Хрыста і Дзевы Марыі. Перад смерцю ён здзейсніў паломніцтва ў Іерусалімскі храм, штоб



*Іл. 1. Смерць св. Іосіфа. Астравецкі раён Гродзенскай вобл., другая палова XVIII ст., палатно, алей, 145×103*

папрасіць у арханёла Міхала дапамогі ў смяротны час. Месцам яго пахавання стала Гефсіманская пячора.

Сюжэт “Смерць св. Іосіфа” даволі часта сустракаецца ў заходнееўрапейскім мастацтве. Аднак у храмах Беларусі такі абраз зафіксаваны толькі аднойчы ў касцёле з Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці (*іл. 1*). У цэнтры кампазіцыі, на ложку, знаходзіцца паміраючы Іосіф. Паабапал ложка стаяць Дзева Марыя і Хрыстос, якія падтрымоўваюць Іосіфа за рукі. Хрыстос суцяшае названага бацьку і паказвае правай рукой угару, дзе змешчана выява Саваофа, ад якога на Іосіфа сыходзіць св. Дух у выглядзе голуба. У правым верхнім куце абраза бачны анёл з кветкавым вянком і сцяблінай лілеі ў руках. На другім плане, з правага боку, прысутнічае постаць невядомай жанчыны.

**Озія** (801–733 до н. э.), таксама вядомы як Азарыя – дзясяты цар Іудзейскага царства, якім ён кіраваў з 791 па 740 г. да н. э. У гады яго валадарства Іўдзейскае царства дасягнула перыяду росквіту. Аднак Озія пажадаў быць не толькі царом, але яшчэ і першасвятаром, чые функцыі маглі выконваць толькі прадстаўнікі дому Аарона. Нягледзячы на пратэсты іудзейскіх святароў, Азарыя ўвайшоў з ахвярніцай у Святы Храм і пачаў ускурваць фіміам на залатым алтары. У той жа момант ён быў пакараны праказай і апошнія гады свайго жыцця, паводле ізраільскіх законаў аб праказе, пражыў у асобным доме за сценамі Іерусаліма.



*Іл. 2. Озія. Шчучынскі раён Гродзенскай вобл., другая палова XVIII ст., палатно, алей, 170×80*

На адзіным абразе, што быў зафіксаваны ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці (*іл. 2*), Азарыя прадстаўлены ўкленчаным перад залатым алтаром з кадзільніцай у правай руцэ. Побач, на прыступках, ляжаць яго карона і скіпетр. У ніжняй частцы абраза на лацінскай мове змешчаны аповед пра гэту падзею.

**Св. Кірык і Іуліта** (пам. каля 305 г.) – святыя пакутнікі, якія пацярпелі падчас ганенняў на хрысціян пры




*Іл. 3. Святыя Кірык і Іуліта. Г. Брэст, першая палова XIX ст., дошка, алей, 71×53*

імператары Дыаклеціане. Згодна жыція, Іуліта разам з трохгадовым сынам Кірыкам, баючыся пакутаў, перабралася з Іконіі ў Тарс, але і там была схоплена і аддадзена на катаванне. Кірык мужна спрабаваў абараніць маці, аднак быў забіты, а Іуліце за яе стойкасць у хрысціянскай веры адсеклі галаву. Памяць святых Кірыка і Іуліты адмячаецца ў Праваслаўнай царкве 28 ліпеня, а ў Каталіцкай – 15 ліпеня.

Абраз з выявай гэтых пакутнікаў зафіксаваны ў храме г. Брэста (*іл. 3*). Іуліта разам з сынам стаяць пад дрэвам на беразе рэчкі, на фоне пагоркаў з гарадской забудовай. Іх позіркі скіраваны ўверх, дзе на аблоках знаходзіцца выява бласлаўляючага Хрыста.

**Св. Іосіф де Каласанс, Святы Юзаф дэ Каласанс** (1557–1648) – каталіцкі святы, педагог, заснавальнік ордэна піяраў. Нарадзіўся ў Іспаніі, пасля навучання ў розных установах атрымаў у 1583 г. святарскія пасвячэнні, у 1592 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэалогіі і пераехаў у Рым. Уражаны цяжкім становішчам дзяцей простага люду, Каласанс у 1597 г. стварыў першую ў Еўропе бясплатную пачатковую школу, даступную для ўсіх дзяцей без абмежаванняў. Неўзабаве да гэтай дзейнасці далучыліся шматлікія паплечнікі Каласанса і пры школе стварылася брацтва, якое ў 1621 г. атрымала ад папы Рыгора XV статус манаскага ордэна Духоўных Рэгулярных Убогіх Маці Божай Пабожных Школ, ці ордэна піяраў, апякункай якога лічыцца Маці Божая Пабожных Школ. Сваёй асноўнай мэтай піяры ставілі выхаванне і навучанне дзяцей і моладзі, і праз нейкі час іхнія школы ствараюцца не толькі ў Італіі, але і ў шэрагу еўрапейскіх краін, такіх як Маравія, Польшча, Іспанія, Германія. Іосіф де Каласанс памёр у Рыме




*Іл. 4. Святы Іосіф де Каласанс.*
*Г. Ваўкавыск Гродзенскай вобл.,*
*другая палова XVIII ст.*
*палатно, алей, 55,5×37,0*




*Іл. 5. Святы Іосіф де Каласанс.*
*Гравюра з выдання: "Hl. Joseph von Calasanza mit Ordensregel der Piaristen. Aus: Lebens-Geschicht. Wien 1749"*

ў 1648г., у 1767 г. быў кананізаваны Папам Кліментам XIII. Папа Пій XII абвясціў яго апекуном хрысціянскіх школ і хрысціянскай адукацыі. Дзень памяці святога ў Каталіцкай царкве – 25 жніўня.

У храмах Гродзенскай вобласці зафіксаваны два абразы з выявай св. Каласанса. На адным (*іл. 4*) ён прадстаўлены пабедрана, ў чорным манаскім аблачэнні, перад невялікім столікам з кнігамі, чарнільніцай і сцяблінай лілеі. У правай руцэ святы трымае гусінае пяро. З абодвух бакоў верхняй часткі абраза знаходзяцца выявы анёлкаў-пуці. Іх позіркі скіраваны ў левы верні вугал, дзе змешчаны сімвал ордэна піяраў – двайная манаграма Багародзіцы. У ніжняй частцы абраза знаходзіцца надпіс: "B. Ioseoh Calasanctius a Matre Dei Scholarum Piarum Fundatorum". Іканаграфія абраза з'яўляецца амаль дакладнай копіяй з гравюры (*іл. 5*), змешчанай у выданні 1749 г. з гісторыяй жыцця Каласанса: "Hl. Joseph von Calasanza mit Ordensregel der Piaristen. Aus: Lebens-Geschicht. Wien 1749". На другім абразе (канец XIX ст., палатно, алей, 196×100) св. Каласанс у манаскім аблачэнні стаіць на прыступках школы з кнігай і гусіным пяром у левай руцэ, а правай нешта тлумачыць у падручніку двум вучням, адзін з якіх укленчаны.



*Іл. 6. Святы Карла Барамеа. Ашмянскі раён Гродзенскай вобл., другая палова XIX ст., палатно, алей, 300×210*

**Св. Карла Барамеа** (1538–1564) – кардынал і святы каталіцкай царквы. Нарадзіўся ў Ламбардыі, у знатнай дваранскай сям'і. Навучаўся праву ў Павіі, потым па закліку Папы Пія IV, якому Карла даводзіўся пляменнікам, пераехаў у Рым, дзе падоўжыў сваю багаслоўскую адукацыю і дзе стварыў акадэмію "Ночы Ватыкана", асноўным накірункам якой стала рэлігійнае выхаванне. У 1560 г. стаў кардыналам, а ў 1563 г. – арцыбіскупам міланскім. На Трыдэнцкім саборы (1545–1563) выступіў як ініцыятар рэформы манаскіх ордэнаў і ўдзельнічаў у яе ажыццяўленні, актыўна змагаўся супраць пратэстантызму. Ён раздаў сваю маёмасць беднякам, дапамагаў хворым і абяздоленным, асабліва падчас чумы ў Мілане ў 1576 г. У 1578 г. заснаваў ордэн аблатаў св. Амбросія. Памёр ва ўзросце 46 гадоў у Мілане, кананізаваны ў 1610 г., дзень памяці – 4 лістапада. Карла Барамеа з'яўляецца святым апекуном духавенства і семінарый.

Творы з выявай св. Карла Барамеа шырока прадстаўлены ў заходнееўрапейскім мастацтве, аднак у касцёлах Беларусі такія абразы зафіксаваны толькі двойчы. Найбольш значным з'яўляецца абраз з Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці (*іл. 6*). Святы прадстаўлены ў кардынальскім аблачэнні, укленчаным перад амбонам у саборы з магутнымі калонамі. Яго правая рука прыціснута да грудзей, позірк скіраваны на распяцце, якое Карла трымае ў левай руцэ. Гэтай жа рукой ён абапіраецца на столік, дзе ляжаць раскрытая кніга і кардынальская шляпа. З верхняга левага вугла, дзе знаходзяцца выявы анёлкаў на аблоках, на Карла Барамеа сыходзіць залацістае ззянне.

**Заручэнне Дзевы Марыі.** Паводле аповеда, што прыведзены ў "Залатой легендзе", Марыя да свайго паўналецця знаходзілася ў Іерусалімскім храме, куды яе ў трохгадовым узросце прывялі бацькі згодна абету, дадзенага імі Богу. Калі

выхаванцам спаўнялася 14 гадоў, яны па звычаю павінны былі пакінуць храм і выйсці замуж. Аднак Марыя заявіла святарам, што дала абет Богу назаўсёды захаваць сваё дзявоцтва і ніколі не выходзіць замуж. Для вырашэння гэтага пытання першасвятар Захарыя звярнуўся да Бога з малітвай і пачуў у адказ, што Марыю дзеля захавання яе цнатлівасці трэба аддаць аднаму з нежанатых прадстаўнікоў дома Давідава, згодна знамення. Першасвятар сабраў дванаццаць такіх прадстаўнікоў, узяў іх посахі і пакінуў на ноч у храме. На другі дзень усе ўбачылі, што посах Іосіфа расцвіў, а калі першасвятар аддаў яго Іосіфу, то зверху зляцеў голуб і сеў на посах. Такім чынам, згодна Божай волі Іосіф заручыўся з Дзевай Марыяй і стаў названым мужам для захавання яе чысціні і дзявоцтва.

Распаўсюджаны ў заходнееўрапейскім мастацтве сюжэт “Заручэнне Дзевы Марыі” найбольш вядомы па створаным у пачатку XVI ст. карцінам П’етра Перуджына і асабліва яго вучня Рафаэля Санці. У цэнтры абодвух карцін са шматфігурнай кампазіцыяй першасвятар Захарыя сваімі рукамі падтрымоўвае працягнутыя адна да адной рукі Марыі і Іосіфа, які рыхтуецца надзець заручальны пярсцёнак на палец Дзевы Марыі. На абразе з Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці (канец XVIII ст., панаўленне, палатно, алей, 200 × 130) выкарыстана цэнтральная частка вышэйазначанай кампазіцыі, аднак падзея заручэння адбываецца непасрэдна ў храме. Дзева Марыя з кветкавым вянком на галаве і Іосіф, які правай рукой адзявае пярсцёнак на палец Марыі, а ў левай трымае расцвіўшы посах, знаходзяцца перад амбонам, адкуль іх бласлаўляе першасвятар Захарыя. На другім абразе з Пінскага раёна Брэсцкай вобласці (*іл. 7*) прадстаўлена не падзея непасрэднага заручэння, а даволі рэдкі сюжэт, калі першасвятар Захарыя, які стаіць з раскрытай кнігай у руках на ўзвышшы ў храме, побач са Скрыжалямі Запавету, аб’яўляе Іосіфу і ўкленчанай побач з ім Дзеве Марыі вестку, што той, згодна Божай волі, павінен ажаніцца на Марыі. З правага боку абраза прысутнічае яшчэ адзін персанаж – прарочыца Ганна, якая на той момант ужо доўгі час жыла пры Ерусалімскім храме пасля



*Іл. 7. Заручэнне Дзевы Марыі. Пінскі раён Брэсцкай вобл, XVIII ст., дошка, алей, 75×60*

смерці свайго мужа і выява якой звычайна прысутнічае на абразах “Стрэчання”. Яна сядзіць на невысокай скамеечцы са счэпленымі рукамі і раскрытай кнігай на каленях, позірк скіраваны на Захарыю.

**Св. Філіп Нэры** (1515–1595) – каталіцкі святы, заснавальнік кангрэгацыі аратарыянаў. Філіп Нэры паходзіў з забяспечанай фларэнтыйскай сям’і і атрымаў рэлігійную адукацыю пры дамініканскім кляштары Сан-Марко. У 18-гадовым узросце ён прыехаў у Рым, дзе наведваў заняткі па філасофіі і тэалогіі. Філіп вёў сціплы вобраз жыцця, праводзіў шмат часу ў малітвах, наведваў катакомбы св. Себасцьяна, замацаваў традыцыю пілігрымак у сем асабліва шануемых базілік Рыма. За прапаведванне Евангелля сярод рымскіх беднякоў, а таксама за дапамогу хворым і нямоглым Філіп Нэры атрымаў прозвішча “Апостал Рыма”. Ён меў вясёлы нораў і падчас прапаведвання заўсёды быў гатовы да забаваў і добрых жартаў. У 1551 г. Філіп Нэры прыняў святарскае пасвячэнне, а ў 1558 г. стаў праводзіць пры царкве, дзе ён служыў, спецыяльныя сустрэчы, якія атрымалі назву “Араторыі” ад слова “размова” – oratio. На гэтых сустрэчах збіраліся як святары, так і свецкія вернікі, яны вывучалі Святое Пісанне, абмяркоўвалі пачутае, праводзілі дыскусіі. Напрыканцы сустрэчы чыталася малітва і выконвалася духоўная музыка, на падставе чаго нарадзіліся тыя музычныя творы, што цяпер завуцца араторыямі. З часам удзельнікі сустрэч сталі называць сябе аратарыянцамі і распрацавалі правілы паводзінаў. У 1575 г. Папа Рыгор XIII сваёй булай зацвердзіў стварэнне Канфедэрацыі аратарыянцаў (філіпінаў), куды маглі ўваходзіць як




*Іл. 8. Святы Філіп Нэры. Іўеўскі раён Гродзенскай вобл., другая палова XVIII ст., палатно, алей, метал, 180×105*

святары, так і міране. У 1575 г. для аратарыянцаў быў пабудаваны новы касцёл Санта-Марыя-ін-Валічэлла, дзе Філіп Нэры правёў апошнія гады свайго жыцця і ў келлі якога завяршыў свой зямны шлях 26 траўня 1595 г. Папа Рыгор XV кананізаваў яго 12 сакавіка 1622 г.; дзень памяці святога ў Каталіцкай царкве – 26 траўня.

На адзіным абразе з Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці (*іл. 8*) прадстаўлена роставая фігура св. Філіпа Нэры, закрытая металічным абкладам, з надпісам знізу "S. FILIP NERIUSZ". У левай руцэ ён трымае палаючае сэрца, як сімвал яго рэлігійнай жарсці, а таксама адлюстраванне аднаго здарэння падчас малітвы ў катакомбах св. Себасцьяна, калі Філіп убачыў вогненны шар, што ўвайшоў у ягоныя вусны, а яго сэрца пашырылася пад уздзеяннем нейкай велізарнай сілы. Правай рукой святы трымае разгорнуты скрутак з надпісам на лацініцы, што ў перакладзе гучыць як "Страх Божы – пачатак мудрасці". З другога боку скрутак падтрымоўвае яшчэ і анёлак з лілеяй у левай руцэ – сімвалам св. Філіпа. Зверху на святога сыходзіць Св. Дух у выглядзе голуба.

1. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щорічник. Львів, 2015. Кн. 2. С. 335–350.

2. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 2) // Історія релігій в Україні: наук. щорічник. Львів, 2016. Кн. 2/3. С. 486–497.

3. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щорічник. Львів, 2017. Кн. 2. С. 152–163.

4. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканаграфіі святых у храмах Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щорічник. Львів, 2018. Кн. 2. С. 95–115.

5. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 5) // Історія релігій в Україні: актуальні питання. Львів, 2019. С. 109–120.

6. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2002. Т. 1. 1906 с.

7. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2005. Т. 2. 1818 с.

8. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2007. Т. 3. 1910 с.

9. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2011. Т. 4. 1962 с.